Мязга, М. М. Адлюстраванне ідэйна палітычнай барацьбы дзвюх дзяржау у савецкай і польскай гістарыяграфіі / М. М. Мязга // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны: навук. зб. Вып. 5 / Рэдкал. У. Н. Сідарцоў (адк. рэд.), С.М. Ходзін (нам.адк. рэд.) [і інш.] – Мн: БГУ, 2009. – С. 45–52.

**М. М. МЯЗГА**

# АДЛЮСТРАВАННЕ ІДЭЙНА-ПАЛІТЫЧНАЙ БАРАЦЬБЫ ДЗВЮХ ДЗЯРЖАЎ У САВЕЦКАЙ І ПОЛЬСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

Грамадскія ўмовы заўсёды былі адным з найважнейшых фактараў, які істотна ўплываў на развіццё гістарычнай навукі. У прыватнасці, знешнепалітычныя задачы, якія вырашае дзяржава, міждзяржаўная барацьба на міжнароднай арэне, несумненна, аказваюць вялікі ўплыў на стан гістарыяграфіі міжнародных адносін, якая развіваецца ў пэўнай краіне. На сённяшні дзень роля гісторыі ў названых грамадскіх працэсах, механізм узаемадзеяння паміж гісторыяй і знешняй палітыкай вывучаны яшчэ вельмі слаба. У дадзеным артыкуле мы паспрабуем прасачыць гэты ўплыў на прыкладзе міжваеннай гістарыяграфіі польска-савецкіхадносін, прааналізаваць,наколькі савецкія гісторыкі ў сваіх даследаваннях зыходзілі з неабходнасці абгрунтавання палітыкі Масквы ў да- чыненні да Польшчы, і польскія — палітыкі сваёй краіны ў адносінах да савецкай Расіі. У той жа час уяўляецца цікавай і пастаноўка пытання аб тым, як ацэнкі савецкіх і польскіх гісторыкаў характару польска-савецкіх адносін у міжваенны час уплывалі на іх развіццё ў той перыяд.

Адносіны паміж Масквой і Варшавай ў міжваенныя гады былі пранізаны вострай канфрантацыйнасцю, што не магло не паўплываць на характар складаўшайся гістарыяграфіі дадзенай праблемы. Асаблівасцю развіцця міжваеннай гістарыяграфіі польска-савецкіх адносін было тое, што фактычна вывучаліся бягучыя злабадзённыя гістарычныя падзеі. Адбывалася станаўленне польска-савецкіх адносін, і паралельна пачынала фарміравацца ў савецкай Расіі і Польшчы гістарыяграфія гэтых адносін.

У савецкай і постсавецкай, у тым ліку і беларускай, гістарыяграфіі праблема ўзаемнага ўплыву гістарыяграфіі і знешняй палітыкі дзяр-



жавы практычна не ўздымалася ў навуковых даследаваннях. Савецкія даследчыкі, безумоўна, прызнавалі ўплыў ідэйна-палітычных фактараў на развіццё савецкай і польскай гістарыяграфіі двухбаковых адносін. Але рабілася выснова, што гэтыя фактары не зніжалі аб’ектыўнасць даследавання савецкіх гісторыкаў, хучэй наадварот. Фундаментальным гістарыяграфічным даследаваннем савецкіх гісторыкаў стала пяцітомнае выданне «Нарысы гісторыі гістарычнай навукі ў СССР». Чацвёрты том гэтай працы прысвечаны развіццю савецкай гістарыяграфіі ў міжваенны час. Аўтары справядліва адзначаюць, што савецкая гістарыяграфія міжнародных адносін выступала перш за ўсё як інструмент ідэйна-па- літычнай барацьбы. Для савецкіх гісторыкаў той эпохі «было характэрна выкладанне знешняй палітыкі, у аснове якога ляжала імкненне выкрыць палітыку знешніх ворагаў СССР»[1]. З гэтым тэзісам звязана і сцвярджэнне, якое ўтрымліваецца ў выданні, што працы савецкіх гісторыкаў па гісторыі міжнародных адносін у міжваенны час насілі пераважна публіцыстычны характар[2]. У значнай ступені абагульняючым даследаваннем па праблеме гістарыяграфіі гісторыі польска-савецкіх адносін для савецкай гістарыяграфіі з’яўляецца артыкул В. А. Дзьякава. Аўтар вылучае тры закончаныя этапы ў даследаванні польскай гісторыі ў СССР. Першы этап ён вызначае як перадваенны з 1917 па 1941 г. Агляд гэтага этапу падаецца толькі ў самым агульным плане[3].

У той жа час пры характарыстыцы савецкімі гісторыкамі польскай міжваеннай гістарыяграфіі адзначалася, што яна не магла быць аб’ектыўнаю перш за ўсё якраз таму, што стаяла на буржуазных ідэйна-палітычных пазіцыях. У якасці яскравага прыкладу такога падыходу да аналізу польскай міжваеннай гістарыяграфіі можна назваць работу Л.А.Зашкільняка. Аўтар адзначае: «Рост рэвалюцыйнай барацьбы, накал класавых бітваў у многім вызначыў ідэйную атмасферу, у якой адбывалася фарміраванне грамадскіх навук у цэлым, у тым ліку гістарыяграфіі»[4]. Такім чынам, ён лічыць польскую міжваенную гістарыяграфію перш за ўсё інструментам класавай барацьбы буржуазіі. Адпаведна, яна не здольна стварыць аб’ектыўную карціну гістарычнага мінулага.

На постсавецкай прасторы з’явіліся гістарычныя работы, аўтары якіх адзначаюць імкненне савецкай ўлады выкарыстаць гістарычную навуку як інструмент для абгрунтавання сваёй знешняй палітыкі. Прыкладам могуць быць даследаванні Р. Г. Піхоя. На яго думку, савецкая ўлада, асабліва з 1930-х гг., палічыла патрэбным актыўна выкарыстоўваць гіста-



рычную навуку для абгрунтавання свайго гістарычнага права на месца ў гісторыі Расіі. Гісторыкі з канца 1920-х гг. павінны былі абгрунтоўваць пераймальнасць палітыкі царскай Расіі і Расіі савецкай, у тым ліку і палітыкі знешняй[5].

У якасці адных з пачынальнікаў вывучэння гісторыі польска-савецкіх адносін мы маем падставы

разглядаць дзяржаўных, палітычных дзеячаў савецкай Расіі і Польшчы. Тым больш што менавіта яны сваімі працамі ўнеслі вялікі ўклад у тое, каб гістарычная навука ператварылася ў фактар ідэйна-палітычнай барацьбы паміж дзвюма краінамі. У гэтай сувязі ў першую чаргу трэба адзначыць працы У. І. Леніна. Найбольш грунтоўную характарыстыку асноўных прынцыпаў савецкай палітыкі ў дачыненні да Польшчы ён даў у такіх працах, як «Палітычная справаздача ЦК РКП(б) на IX Усерасійскай канферэнцыі УКП(б) 22 верасня 1920 г.»[6] і «Прамова на з'ездзе рабочых і служачых кажэвенай вытворчасці 2 кастрычніка 1920 г.»[7]. Да асобных праблем савецка-польскіх адносін У. І. Ленін звяртаецца і ў іншых сваіх работах. Яго высновы аб агрэсіўнасці «буржуазна-памешчыцкай Польшчы» ў дачыненні да савецкай Расіі, аб тым, што Польшча з'яўлялася краевугольным каменем Версальскай сістэмы, сталі асноваю для развіцця савецкай гістарыяграфіі савецка-польскіх адносін міжваеннага часу. Польская агрэсія ў працах Леніна падаецца як частка агульнага «белага» руху. Менавіта ён увёў тэрміны, якія актыўна выкарыстоўвала потым савецкая гістарыяграфія: «белапалякі», «польскія белагвардзейцы». У. І. Ленін адзначае, што пасля завяршэння вайны з Польшчаю не проста наступіла мірная перадышка, а ўсталявалася працяглае становішча, калі савецкая Расія будзе існаваць у акружэнні капіталістычных дзяржаў[8]. Тым самым быў пакладзены пачатак папулярнаму ў савецкай гістарыяграфіі тэзісу аб мірным суіснаванні краін з розным сацыяльным ладам.

Прадстаўляецца неабгрунтаваным тэзіс некаторых савецкіх гісторыкаў аб тым, што рэальнае вывучэнне гісторыі савецка-польскіх адносін міжваеннага часу пачалося ў СССР толькі пасля Другой сусветнай вайны. Ужо ў 1920-я гг. у савецкай Расіі з'яўляюцца гістарычныя працы, прысвечаныя гэтай праблеме, якія безумоўна заслугоўваюць увагі даследчыкаў гістарыяграфіі міжнародных адносін. Гэта працы С.Гесена[9], Ф. Кона[10], С. Пятрухіна[11], Я. Радапольскага[12], якія непасрэдна прысвечаны знешняй палітыцы Польшчы. Яна ў гэтых працах паказваецца як мілітарысцкая дзяржава, якая выношвае агрэсіўныя планы ў дачыненні да СССР. Варшава абвінавачваецца ў

47

падрыхтоўцы вайны і імкненні стварыць антысавецкі блок уздоўж заходніх меж Расіі. Па сутнасці, гэтыя працы тым самым абгрунтоўвалі тэзіс тагачаснай савецкай знешняй палітыкі, згодна з якім менавіта Польшча з'яўлялася той краінай, ад якой для савецкай Расіі зыходзіла найбольш верагодная ваенная пагроза. Тэзіс савецкіх гісторыкаў аб асаблівай агрэсіўнасці Польшчы ў дачыненні да СССР у вырашальнай ступені сфарміраваўся пад уплывам такога палітычнага фактара, як польска-савецкая вайна 1919—1920 гг. Прычым на ацэнкі савецкімі гісторыкамі знешняй палітыкі Польшчы ўплываў стан адносін савецкай Расіі з іншымі краінамі.

Характэрна, што Я. Радапольскі і С. Пятрухін фактычна звязваюць у адно цэлае варожую палітыку з боку Польшчы ў дачыненні да савецкай Расіі ў 1920-я гады з гэтакай жа яе палітыкай у дачыненні да Германіі. Так, у рабоце Я. Радапольскага ўказваецца, што Польшча, якая ідзе ў фарватары французскай палітыкі, вядзе актыўную падрыхтоўку да вайны як з СССР, так і з Германіяй[13]. Заўважым, што абвінавачванні Польшчы ў агрэсіўных памкненнях у дачыненні не толькі да СССР, але і да Германіі былі характэрны для савецкай гістарыяграфіі да таго часу, пакуль існавалі савецка-германскія сяброўскія адносіны ў рамках палітыкі Рапала. Менавіта ўплывам гэтай палітыкі можна тлумачыць тое, што С. Пятрухін у сваёй рабоце фактычна гаворыць аб несправядлівасці тых тэрытарыяльных змен, якія адбыліся па Версальскаму дагавору за кошт Германіі на карысць Польшчы[14].

Акрэслены вышэй падыход савецкіх гісторыкаў адносна ўплыву германскага фактара на польска-савецкія адносіны быў пераняты імі з прац палітычных дзеячаў савецкай Расіі. Напрыклад, член калегіі Народнага камісарыята замежных спраў Я. Ганецкі ў адной са сваіх работ адзначаў несправядлівы характар польска-германскай мяжы, якую ўсталяваў Версальскі дагавор, бо яна стварае перашкоды Германіі ў адміністрацыйным і гаспадарчым развіцці і небяспечна з ваеннага пункту гледжання[15]. Калі ж з усталяваннем у Германіі фашысцкай дыктатуры скончыўся рапальскі перыяд у савецка-германскіх адносінах, савецкая гістарыяграфія ўслед за палітычным кіраўніцтвам краіны стала актыўна адстойваць тэзіс, згодна з якім збліжэнне Польшчы з фашысцкай Германіяй адмоўна ўплывае на стан польска-савецкіх адносін. Прыкладам такога падыходу можа служыць артыкул І. Высоцкага, які ў 1935 г. быў надрукаваны ў часопісе «Коммунистический Интернационал»[16].

48

Важным полем ідэйна-палітычнай барацьбы паміж савецкай Расіяй і Польшчай у 1920—1930 гг. з'яўлялася Заходняя Беларусь. Савецкая гістарыяграфія не засталася ў баку і ад гэтай барацьбы. У якасці ілюстрацыі можна прывесці работы І. Ф. Лочмеля. Аўтар адстойвае тэзіс, згодна з якім беларускі працоўны люд на працягу многіх стагоддзяў вёў барацьбу супраць польскіх паноў, і нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі ў 1921—1939 гг. з'яўляўся яе этапам. Гэты рух быў выкліканы тым жорсткім акупацыйным рэжымам, які ўсталявала Польшча, а мэта барацьбы заключалася ў аб'яднанні з БССР[17]. Адной з найважнейшых задач савецкай знешняй палітыкі ў міжваенны час было далучэнне да СССР Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. У сувязі з гэтым перад савецкай гістарычнай навукай стаяла задача абгрунтаваць гэтае далучэнне. Адсюль і асаблівы акцэнт у работах савецкіх гісторыкаў на жорсткае

нацыянальнае і сацыяльнае прыгнечанне насельніцтва Заходняй Беларусі польскімі ўладамі і яго барацьбу за ўз'яднанне з СССР. Тым самым грамадская думка рыхтавалася да таго, каб з разуменнем сустрэць гэтае ўз'яднанне.

Фарміраванне польскай гістарыяграфіі савецка-польскіх адносін у першыя гады развіцця гэтых адносін, на наш погляд, адбывалася яшчэ больш актыўна, чым савецкай. Пры гэтым яна літаральна з першых дзён свайго існавання выступіла як сродак абгрунтавання знешнепалітычных планаў польскай дзяржавы на ўсходзе. Пачатак гэтаму быў пакладзены ў працах польскіх палітыкаў міжваеннага часу, прысвечаных гісторыі знешняй палітыкі сваёй краіны 20—30-х гг. XX ст., у прыватнасці польска-савецкіх адносін. Гэта работы Ю. Пілсудскага, С. Грабскага, Р.Дмоўскага, А. Скшыньскага, У. Сікорскага. На тыя ацэнкі характару і стану савецка-польскіх адносін, якія былі выказаны ў гэтых работах, у многім абапіралася польская гістарыяграфія.

У 1923 г. выйшла в свет праца вядомага польскага дыпламата А.Скшыньскага «Польшча і мір». У ёй аўтар агучвае тэзіс, згодна з якім перш за ўсё Германія з'яўляецца непрымірымым ворагам Польшчы ў сувязі з тым, што апошняя актыўна падтрымлівае Версаль. Разам з Германіяй у лік ворагаў Польшчы аўтар уключае і Расію[18]. Сярод польскіх палітыкаў шырока распаўсюдзіўся пункт гледжання, згодна з якім Германія і савецкая Расія прыкладалі вялікія намаганні, каб дабіцца ўзмацнення міжнароднай ізаляцыі Польшчы. Пры гэтым яны пільна сачылі адзін за адным у плане развіцця адносін з Польшчай і імкнуліся не дапусціць іх паляпшэння. Адносіны, якія існавалі паміж



Германіяй і савецкай Расіяй у час Рапала, характарызаваліся як сяброў- скія, і адзначалася, што сяброўства гэтае мела антыпольскі характар[19]. Такім чынам, у працах польскіх палітыкаў яскрава гучыць тэзіс аб тым, што Польшча размешчана паміж дзвюма краінамі, якія з'яўляюцца яе асноўнымі праціўнікамі на міжнароднай арэне.

Ужо ў час польска-савецкай вайны 1919—1920 гг. у Польшчы былі выдадзены працы, аўтары якіх рабілі агляд першых крокаў у станаўленні адносін паміж савецкай Расіяй і Польшчай і спрабавалі з гістарычнага пункту гледжання абгрунтаваць прэтэнзіі Польшчы на землі на ўсходзе, якіяне з'яўляліся этнічна польскімі. У 1919 г. выйшла праца К.Олендскага «Крэсы ўсходнія і Польшча». Аўтар сцвярджае, што жыхары тых зямель, якія ён называе «ўсходнімі крэсамі», не здольныя стварыць моцны ўрад, які абапіраўся б на гістарычныя традыцыі. Таму ўсходнія землі непазбежна зноў патрапілі б у «маскоўскую няволю». Далей К.Олендскі робіць выснову, што на крэсах можна стварыць толькі тую дзяржаву, якой дапаможа выжыць моцны сусед. Такім суседам, на яго думку, можа быць толькі Польшча[20]. Фактычна аўтар абгрунтоўвае федэралісцкую канцэпцыю Ю. Пілсудскага.

Падтрымка той жа федэралісцкай канцэпцыі гучыць і ў выдадзенай у 1920 г. працы В. Каліноўскага «Усходняе пытанне і Беларусь». Аўтар падвяргае крытыцы інкарпарацыйную канцэпцыю польскай эндэцыі, указваючы на тое, што нават беларусаў-каталікоў будзе цяжка паланізаваць. Больш рэалістычнай, на яго думку, з'яўляецца канцэпцыя стварэння федэрацыі Польшчы з дзяржавамі, якія ўзніклі на заходніх ускраінах былой Расійскай імперыі[21]. С. Кучэба ў сваіх даследаваннях, наадварот, імкнецца паказаць утапічнасць фэдэралісцкай ідэі і абгрунтоўвае канцэпцыю інкарпарацыі як больш рэалістычную[22].

Пасля завяршэння польска-савецкай вайны правячыя колы Польшчы разглядалі савецкую Расію як краіну, якая мае агрэсіўныя планы. Гэты тэзіс зноў жа атрымаў абгрунтаванне ў польскай гістарыяграфіі. Прыкладам тут можа служыць кніга Ё.Канечнага, выдадзеная ў 1921г. Ён даказвае, што Расія з'яўляецца найстарэйшай мілітарыстычнай дзяржавай Еўропы, ад якой пастаянна зыходзіць пагроза вайны. З прыходам да ўлады бальшавікоў у гэтым плане сітуацыя не змянілася[23].

Безумоўна, гэтыя працы насілі пераважна публіцыстычны характар. Больш высокім навуковым узроўнем даследавання знешняй палітыкі Польшчы вызначаліся больш познія працы Ю. Гжымала-Грабавецкага[24],



К. Куманецкага[25], С. Кучэбы[26]. У іх у 20—30-я гг. XX ст. сфарміравалася асноўная канцэпцыя гісторыі польска-савецкіх адносін польскай гістарыяграфіі міжваеннага часу — канцэпцыя «двух ворагаў». Гэтая канцэпцыя, безумоўна, з'яўлялася адлюстраваннем той ідэйна-палітычнай барацьбы, якая вялася паміж дзвюма дзяржавамі. У адпаведнасці з ёю савецкая Расія і Германія разглядаліся як асноўныя і небяспечныя праціўнікі Польшчы на міжнароднай арэне, якія заціснулі яе ў «геапалітычныя ціскі». У працах даследчыкаў польскай знешняй палітыкі ў 1920-я гг. пастаянна падкрэсліваецца агрэсіўнасць СССР і Германіі ў дачыненні да Польшчы, іх імкненне ажыццявіць рэвізію польскіх меж[27].

Калі ў 1930-я гг. геапалітычная сітуацыя змянілася і рапальская палітыка прыйшла да свайго завяршэння, польскія гісторыкі сталі падаваць «палітыку раўнавагі» Ю. Пілсудскага як найважнейшы інструмент, з дапамогай якога ўдалося дабіцца разбурэння расійска-германскіх «геапалітычных ціскоў».

Агульнасць развіцця гістарыяграфіі польска-савецкіх адносін і ў Польшчы, і ў СССР заключалася ў тым, што ў абедзвюх краінах яна выступала як важны інструмент абгрунтавання знешняй палітыкі сваёй

краіны. Пэўнае адрозненне заключалася ў тым, што ў Польшчы пэўны плюралізм па пытаннях знешняй палітыкі параджаў і наяўнасць розных пунктаў гледжання ў гістарыяграфіі польска-савецкіх адносін. У СССР гісторыкі былі пастаўлены перад жорсткай неабходнасцю ў гістарычных даследаваннях безумоўна падтрымліваць і абгрунтоўваць знешнюю палітыку сваёй краіны.



[1] Очерки истории исторической науки в СССР. В 5 т. М., 1966. Т. 4. С. 514.
[2] Очерки истории исторической науки в СССР. В 5 т. М., 1966. Т. 4. С. 513.
[3] *Дьяков В. А.* Изучение истории Польши советскими учеными // Новая и новейшая история. 1985. № 6. С. 146—160. С. 146-147.
[4] *Зашкильняк Л. А.* Формирование и развитие исторической науки в Польше. Львов, 1986. С. 52-53.
[5] *Пихоя Р. Г.* Восстребованная временем история. Отечественная историческая наука в 20—30-е годы XX века // Новая и новейшая история. 2004. № 2. 28—53. С. 41.
[6] *Ленин В. И.* Политический отчет ЦК РКП(б) на IX Всеросийской конф. РКП(б) 22 сент.1920г. // Полн. собр.соч. Т. 41.
[7] *Ленин В. И.* Речь на съезде рабочих и служащих кожевенного производства 2 октября1920г.//Полн.собр.соч.Т.41.
[8] *Ленин В. И.* Наше внешнее и внутреннее положение и задачи партии. Речь на беспартийной конференции рабочих и красноармейцев Краснопресненского райо- на 24 января 1920 года // Полн. собр. соч. Т. 40. С. 18.
[9] *Гессен С. Я.* Окраинные государства: Польша, Финляндия, Эстония, Латвия, Литва. М., 1925.
[10] *Кон Ф.* Современная Польша. М., 1924.
[11] *Петрухин С.* Как Польша готовится к войне. М., 1926.
[12] *Радопольский Я.* Польша готовится к войне. М.; Л., 1929.
[13] *Радопольский Я.* Польша готовится к войне. М.; Л., 1929.
[14] *Петрухин С.* Как Польша готовится к войне. М., 1926. С. 21.
[15] *Ганецкий Я.* Советско-германский торговый договор. М.; Л., 1926. С. 13.
[16] *Высоцкий И.* Внешняя политика фашистской Польши // Коммунистический Интернационал. 1935. № 16—17. С. 10—17.
[17] *Лочмель И. Ф.* Очерки истории борьбы белорусского народа против польских панов. М., 1940. С. 154-155.
[18] *SkrzynskiAl.*Polskaapokoj.Warszawa,1923. С. 84-85.
[19] *SikorskiWl.*PolskaiFrancja.Lwow,1931. С. 141.
[20] *OledzkiK.*Kresywschdniea Polska.Warszawa,1919. С. 5-8.
[21] *KalinowskiW.*Kwestjawshodniaa Bialorus.Warszawa,1920. С. 6.
[22] *Kutrzeba S.* Polska odrodzana. 1914—1922. Krakyw, 1923. С. 167-168.
[23] *KoneznyJ.*Polskielogosaetnos.Warszawa,1921.T.1. С. 240-242.
[24] Grzymala-GrabowieckiJ.PolitykazagranicznaPolskawroku1924.Warszawa,1925.
[25] *Kumaniecki K.* Odbudowa panstwowosci Polskiej. Warszawa — Krakyw, 1924.
[26] *KutszebaS.*Naszapolitykazagraniniczna.Krakyw,1923.
[27] Grzymala-GrabowieckiJ.PolitykazagranicznaPolskawroku1924.Warszawa,1925.